**Электронное средство обучения**

# *«Палеская ластаўка. Жыццёвы і творчы шлях Яўгеніі Янішчыц»*

Пинск 2016

# Змест


- Старонкі біяграфіі
- «Палеская ластаўка». Творчасць
- Палёт у «вечнасць»
- Памяць аб Ясяльдзянцы

# Старонкі біяграфіі

*Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц нарадзілася 20 лістапада 1948 года ў вёсцы Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў простай сялянскай сям'і.*





# Бацькі





Маці Жэні — Марыя Андрэеўна, бацька — Іосіф Сцяпанавіч, працавалі ў калгасе

*У 1955 годзе Жэня пайшла ў першы клас Рудкаўскай пачатковай школы. У чацвёртым класе Жэня напісала свой першы верш і прысвяціла яго маці.*



*Пасля заканчэння Рудкаўскай пачатковай школы Жэня вучылася ў Мерчыцкай васьмігодцы.*





1 верасня 1963 Жэня прыйшла ў 9 клас Парэцкай сярэдняй школы.








У 1966 Яўгенія закончыла 11 класаў Парэцкай сярэдняй школы і ў жніўні паступіла на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры БДУ. З 21 кастрычніка 1969 Жэня пачала друкаваць свае вершы амаль што ў кожнай газеце «Беларускі універсітэт».



У 1971 – 1974 гадах была на творчай працы. Выйшаўшы замуж за паэта Сяргея Панізніка, тады яшчэ вайскоўца, некалькі месяцаў загадвала бібліятэкай адной з воінскіх часцей БВА, жыла ў Чэхаславакіі. У 1974 – 1976 гадах – зноў на творчай працы.

З 1976г. – літкансультант «Сельскай газеты». З 1983г. - загадчык аддзела паэзіі часопіса «Маладосць». У апошнія гады жыла адна, выхоўвала сына.





- *Адбірался дэпутатам раённага Савета Савецкага раёна г.Мінска, членам праўлення і прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1981 годзе прымала ўдзел у рабоце Генеральнай Асамблеі ААН.*

- *Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Купалы(1986год – за кнігу лірыкі «Пара любові і жалю»), прэміі Ленінскага камсмола Беларусі (1978 год – за кнігу лірыкі «Дзень вечаровы»).*

# «Палеская ластаўка». Творчасць



Паэтычны дэбют Яўгеніі Янішчыц адбыўся рана . Свой першы верш яна напісала , калі вучылася ў Мерчыцкай школе, будучы сямікласніцай. Выкладчык беларускай мовы і літаратуры Аркадзь Міронавіч Грэчка даў ёй падрыхтаваць верш да дня 80-годдзя Якуба Коласа. Але яна вырашыла: а што, калі напісаць самой... І яна напісала верш, прысвечаны Я.Коласу. Пасля гэтага пісала вершы яшчэ чвэрць стагоддзя.



*Будучы вучаніцай 10 класа Парэцкай сярэдняй школы, Жэня Янішчыц стала пераможцай конкурса юных паэтаў, які быў яб’яўлены радыёстанцыяй беларускага радыё «Арляняты».*

*Тады сотні вершаў паступалі на конкурс з усіх куткоў рэспублікі, але першае месца было прысуджана Яўгеніі Янішчыц.*

*У 1967 годзе сям’я Жэні Янішчыц пераязджала з вёскі. Жэня знаходзілася толькі на пачатку сваёй паэтычнай творчасці, але ўсе ж спецыялісты адзначалі даволі высокі ўзровень яе літаратурнага майстэрства. Гэта яшчэ раз пераконвала ўсіх у вялікай адоранасці знакамітай «палескай ластаўкі».*



Рукапіс Я.Янішчыц

*Як паэтэса Яўгенія Янішчыц выступала з 1964 года. У шаснаццацігадовым узросце Жэня ўжо мела першы апублікаваны ў рэспубліканскай перыёдыцы верш. Верш «Зоры над Пінаю», надрукаваны ў часопісе «Бярозка», пасля перадрукаваны газетай «Літаратура і мастацтва».*



Шмат вершаў яна прысвяціла свайму духоўнаму настаўніку Фёдару Фёдаравічу Цудзіле, які не толькі падказаў, заўважыў першыя яе пошукі ў свеце паэтычнага слова.


Любімаму настаўніку

Класнаму кіраўніку XI б
Фёдару Фёдаравічу Цудзілу

Хутка развітаемся са школай,
Але не гаворым ёй „бывай"
[illegible]

[illegible], 22.10 .[illegible]

[illegible]



Пісьмо да Ф.Ф. Цудзіла

*У старэйшых класах вяла перапіску з Нілам Гілевічам, а затым было столькі пройдзена паэтычных дарог. Сумесныя літаратурныя вечары і ранішнікі, дні паэзіі і прозы, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі – усё гэта яднала ў працы.*




*У 1970 годзе выйшаў з друку першы зборнік Яўгеніі Янішчыц «Снежныя грамніцы», прыязна і зацікаўлена сустрэты чытацкай публікай і крытыкай. Ён сабраў найбольш багаты ўраджай рэцэнзій у параўнанні з усімі наступнымі кнігамі паэтэсы.*





Літаратурная старонка

штомесячны выпуск

КАЛЯ БРЭСТА

РАНІЦА Ў ВЁСЦЫ

МОВА

ПАЛАНЕЗ АГІНСКАГА

АГОНЬ ЗАРЫ

СТЫХІЯ МОЦНЫХ—БУРА

ЗЯРНЯТКА

ВОСЕНЬ

ПОЧЫРК МАЙСТРА

ПРЫЙДЗІ

Вершы Жэні змяшчаліся ў часопісах «Маладосць», «Беларусь», «Нёман», «Молодая гвардия», «Дружба народов», «Огонёк», газетах «Литературная Россия», альманаху «Поэзия», штогодніку «Дзень паэзіі», калектыўных зборніках БДУ і Гамбургскага педінстытута, у анталогіі маладой беларускай паэзіі на Украіне. Яўгенія Янішчыц з'яўлялася дыпламантам белааруската фестывалю творчасці маладых (1970).

*Са словам «люблю» ласкава звярталася паэтэса да роднай зямлі, да маці, да каханага.*

*Сем зборнікаў паэзіі напісала Я.Янішчыц. Гэта:*

- *«Дзень вечаровы»*
- *«Снежныя грамніцы»*
- *«Ясельда»*
- *«На беразе пляча*
- *«Пара любові і жалю»*
- *«Каліна зімы»*
- *«У шуме жытняга святла».*









## Мова

Чую тваю жаўрукавую музыку
У скошаных травах мурожных,
Мова! Як сонца маё
беларускае,
Ты свецішся словам кожным.
Цябе і заворвалі, і закопвалі.
І ўсё ж нашы продкі праз гора
Данеслі да нас цябе,
родную, цёплую,
Жывую і непаўторную.
І калі ты мяне толькі паклічаш,
Памру за цябе без енку.
Нашу я любоў да цябе
вялікую
У сэрцы сваім маленькім.



Паэзія Я.Янішчыц перакладалася на многія мовы свету. У 1985 годзе выйшла яе кніга вершаў у перакладзе на рускую мову Рымай Казаковай – «Спроси у чебреца».

Звярталася Я.Янішчыц і да прозы, напісала некалькі апавяданняў, у якіх выведзены яскравыя народныя тыпы.




Даволі плённа працавала паэтэса ў галіне мастацкага перакладу, узнаўляючы па-беларску вершы рускіх і украінскіх паэтаў.



Час ад часу змяшчаліся ў друкаваных выданнях яе артыкулы і рэцэнзіі. Сваімі думкамі і назіраннямі над творчым працэсам Я.Янішчыц дзеліцца з чытачамі ў інтэрв'ю, змешчаным у 1985 годзе ў газеце «Літаратура і мастацтва».



З 1995 года па ініцыятыве Пасольства ў Рэспубліцы Балгарыя за сродкі, прыцягнутыя Пасольствам, выдаваліся кнігі Яўгеніі Янішчыц.

# «Хто забраў мой самы светлы сон, што цяпер не сніцца мне начамі…»




*Яўгенія Янішчыц прыняла заляцанні паэта Сяргея Панізніка і выйшла за яго замуж . Іхняе вяселле ў літаратурным асяроддзі назвалі падзеяй года. На сваім вяселлі , 19 жніўня 1971 года , Жэня была счаслівай. Маладыя, Яўгенія і Сяргей Панізнік выглядалі шыкоўна. Госці былі знакамітыя: амаль усе сталічныя паэты і пісьменнікі , сярод іх – Іван Мележ. Сваты, аб якіх толькі марыць можна - Ніл Гілевіч – паэт, перакладчык, фалькларыст; Язэп Семяжон - перакладчык «Песні пра зубра»; некалькі аднакурснікаў.*



Усе жадалі шчасця маладым, плённай творчасці, выказвалі надзею, што «птушка ў рэшце рэшт будзе прыручанай».

Праз час у маладых нарадзіўся сын Андрэй.





Але ці шлюб не вытрымаў выпрабаванне славай, ці сапраўды любоўная лодка разбілася аб быт. Дзве душы, мабыць, замкнуліся адна на адной і сталі ў сваім развіцці, што асабліва згубна для творчых асоб. Стала цесна, не хапала паветра…
Янішчыц засталася з сынам, творчасцю і кар'ерай…

*У лістах да сяброўкі Тамары Аўсяннікавай Жэня Янішчыц выказвала ўсе свае пачуцці, перажыванні, якія яе апаноўвалі:*



*«Милая Тамарка, здравствуй! Извини, что долго тебе не писала, таким тягостным и трудным для меня было последнее время минувшего года, что врагу, как говорится, не пожелаешь. Но все окончилось.*
*<…> Трудно и горько об этом вспоминать, тем более писать. <…> Как бы ни было трудно, всеми силами старайся сохранять семью… Одиночество - это невеселое дело»*

*З цягам часу ўсе, асабліва сяброўкі Я. Янішчыц, разумелі адно – Жэня ўсё яшчэ кахае былога мужа. І ў гэтым была яе драма.*

*Прыродны паэтычны дар. І цяжкая жыццёвая дарога. Вялікая творчая ўдача, высокі лірычны ўзлёт і глыбокая асабістая драма – трагічны выхад.*

*Агульны настрой Янішчыц быў неадназначны. Адзінае выратаванне ў яе – вершы! Яны рэжуць душу па жывому. Але яны ж і нясуць ёй лекі.*

***За што, скажы, твой вобраз мілы***
***Насіла ў сэрцы, як магла?***
***І разлюбіць – не разлюбіла.***
***І зберагчы – не зберагла.***





*Усё часцей у апошнія гады жыцця Яўгенія Янішчыц апраналася ў чорнае, ўсё часцей яе бачылі ў стане, блізкім да дэпрэсіі, ўсё часцей яна прасіла прабачэння ў сяброў, даравала сама і развітвалася з роднымі. 20 лістапада 1988 года ў Саюзе пісьменнікаў адзначылі яе саракалецце – былі падарункі, кветкі, добрыя словы, але шчасця ў жыцці паэтэсы гэта не адрадзіла… Яна хадзіла па зямлі, а жыла нябёсамі. І аднойчы вырашыла спазнаць вышыню да канца. Праз некалькі дзён пасля свайго дня нараджэння яна ступіла «у вечнасць» з восьмага паверха…*

*Няхай грамы ператрасаюць,*
*Пераварочваюць мой шлях,*
*Але гудзе любові крылле,*
*Шчаслівы славячы прыгнёт.*
*Жыццё маё, і там, на схіле,*
*Ты ўсё – загадкавы палёт.*





25 лістапада 1988 года трагічна загінула і пахавана на Усходніх могілках у Мінску.

# Памяць аб Ясяльдзянцы



Што застаецца ў памяць пра паэта? Чалавецтву – вершы, а той яго частцы, якая не можа адасобіць творы ад самаго майстра, - чарнавікі, паперы, аўтографы. І тым больш яны каштоўныя ў вачах знаўцаў і шчырых аматараў, чым глыбей дазваляюць зазірнуць ў творчае станаўленне паэта.



У вёсцы Парэчча Пінскага раёна 21 лістапада 1998 года да 50-годдзя паэтэсы быў адкрыты музей. Рзмешчаны ў Парэцкай базавай школе, дзе вучылася Жэня Янішчыц. У музеі сабрана каля 1000 экспанатаў.






Вучні адшуквалі нізкі вершаў Яўгеніі Янішчыц, артыкулы, дзе ўзгадвалася яе прозвішча, неслі ў школу. У хуткім часе знайшоўся сшытак з юнацкімі вершамі паэткі.

Былі прыкладзены вялікія намаганні, каб сабраць колішнія лісты, падключыць літаратараў да пошуку. Знайшлося 55 вершаў, напісанных у школе, нікому раней не вядомых.



І ДУМКІ, НІБЫ ПАРАСТКІ ВЯСНЫ

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ

ПРАЧЫНАЮСЯ ВЯСНОВА

Верш нерасіліў нематы.
І яркіх фарбаў мне не шкода,
Бо і сама я, як прырода,
То ападаю,
то цвіту.

Яшчэ зямлі мяне вучыць
Любві, што будзіць нас
штодзённа
І верш яшчэ па целе
сонным

І новай
музыкай
гучыць!

Святлом і цішаю сагрэта,
Перабіраю валасы.
Ва мне вясны,
зімы
і лета
І лістападаў галасы.

Ва мне адвечных думак бой.
Усё мяшаецца нанова.
...Я прачынаюся вясною,
Нібы загон перад сяўбой...

* * *

Мяне вы быццам бы забылі.
Мяне паспешна падзялілі

На боль, святло,
на гнеў,
на ласку,
На недачытаную казку,
На чорны сум,
на белы сад,
На лістапад,
на снегапад,
На змену буднаў і нядзель.
І ўжо цяпер зусім далёка
Я аддалілася, як лодка,
Ад берагоў і ад людзей.
Плыву ракою паўнаводнай.
Чыё вясло? Чыя сасна?..
Не раздзяляйце, як прыроду,
На ўсе чатыры поры года!
Я толькі гулкая вясна.

Людміла ЗАБАЛОЦКАЯ

САКАВІЦКІЯ ЛЮСТЭРКІ



Літаратурная старонка

Штомесячны выпуск

МАРАТУ КАЗЕЮ

Мова

Ранак

СЛОВА ДА ЗЯМЛІ

ПАХНЕ ЖЫВІЦАЙ

Нераст



ЖЭНІНА МАМА

*У цяперашнім музеі – атэстат і дыплом паэткі, медаль лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, стос рэдкіх фотаздымкаў, уласныя рэчы.*

*Вялікую дапамогу ў зборы матэрыялаў аказалі: рэдактар газеты «Звязда» Уладзімір Андрыевіч, пісьменнікі Ніл Гілевіч, Васіль Жуковіч, драматург Алесь Разанаў, паэтэса Ніна Мацяш, аднакласніца Ніна Ганчарык, выкладчыкі Мінскага дзяржаўнага універсітэта Алег Лойка, Таццяна Шамякіна.*









*Экспазіцыя музея складзена з раздзелаў «Сцежкі майго краю»; «Тут дужэлі крылы»; «Узмужнелы талент»; «Памяць пра палескую кнігаўку».*














З мэтай ушанавання памяці «палескай кнігаўкі» у сакавіку 1998 года было вырашана надаць яе імя раённай цэнтральнай бібліятэцы. У горадзе Пінску імем Яўгеніі Янішчыц названа вуліца ў новым мікрараёне.

Кожны год да дня нараджэння Я. Яншчыц ва ўстановах культуры афармляюцца выставы літаратуры і артыкулаў, праводзяцца сустрэчы пісьменнікаў і паэтаў, у школах – літаратурныя часы, прысвечаныя творчасці Я.Янішчыц.

# «Запомніце мяне, якая ёсць...»

Такой прысні, як яблыневы сад.
Там не ачахла сонечная сцежка.
Хвалюецца высокі снегапад,
А на губах – іскрыстая ўсмешка...
Запамятай такою, як была,
Здзірала як нясцерпныя кляйноты.
Смяюцца вочы, поўныя святла.
А на губах гарчавінкі самоты...



# Аўдыёзапісы

«Ты цяпер немагчыма далёка»

«Па-беларуску»

«Ты пакліч мяне, пазаві»



# Пытанне 1

*Дзе нарадзілася Яўгенія Янішчыц?*

# Пытанне 2

У якім годзе Жэня пайшла ў першы клас?

# Пытанне 3

У якім годзе Жэня пачала друкаваць свае вершы?

# Пытанне 4

*Калі стала лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі імя Я.Купала?*

# Пытанне 5

***У якім узросце Яўгенія ўжо мела першы апублікаваны ў рэспубліканскай перыёдыцы верш?***

# Пытанне 6

***У якім годзе выйшла яе кніга  вершаў у перакладзе на рускую мову Рымай Казаковай – «Спроси у чебреца»?***

# Пытанне 7

*У якім годзе Жэня выйшла замуж за Сяргея Панізніка?*

# Пытанне 8

Імя сына Яўгеніі?

# Пытанне 9

*Калі адзначылі саракалецце Яўгеніі?*

# Пытанне 10

***Укажыце дату, калі трагічна загінула Яўгенія Янішчыц?***

Выход